Вучэбная дысцыпліна па выбару студэнтаў
**«ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА НАРОДА (У КАНТЭКСЦЕ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ)»**

Выкладчыкі: ГРАБЯНЧУК Ігар Васільевіч – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі і сацыяльных навук; НОВІКАЎ Сяргей Яўгеньевіч – кандыдат гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі і сацыяльных навук;

## Кароткая анатацыя зместу дысцыпліны

Вучэбная дысцыпліна «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» прадугледжвае раскрыццё сутнасці супярэчлівых міжнародных адносін напярэдадні і ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны, адлюстроўвае іх уплыў на ўмацаванне тэрытарыяльна-дзяржаўнай цэласнасці Беларусі. Асвятляе гераічныя і трагічныя старонкі ваеннай гісторыі, раскрывае жыццё мірнага насельніцтва на акупаваных тэрыторыях і ў савецкім тыле, паказвае ўклад беларускага народа ў разгром германскіх агрэсараў. Значная ўвага ў матэрыялах курса надаецца паказу ролі моладзі ў ваенна-палітычным жыцці акупаванай Беларусі, барацьбе юнакоў і дзяўчат у радах партызан, дзейнасці камсамольска-маладзёжнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Курс прадугледжвае больш паглыбленае вывучэнне фактаў ваеннай гісторыі на аснове выкарыстання малавядомых архіўных крыніц, у тым ліку нямецкага паходжання, а таксама айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Слухачам курса прадстаўляецца магчымасць актыўнага ўдзелу ў па-зааўдыторнай экскурсійнай дзейнасці, у тым ліку ў ходзе наведвання БДМГВАВ, Мемарыяла “Яма”, Мемарыяльнага комплексу “Трасцянец”.

## Літаратура:

1. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны) : вучэбны дапаможнік / А.А. Каваленя [і інш.]; пад рэд. акадэміка А. А. Кавалені. – Мінск: РІВШ, 2022. – 280 с.